*Галоўнае ўпраўленне па адукацыі*
*Мінскага абласнога выканаўчага камітэта*
*Установа адукацыі*
*«Слуцкі дзяржаўны індустрыяльны каледж»*

**Конкурс інфармацыйна - метадычных распрацовак культурна - дасугавых мерапрыемстваў**
**для навучэнскай моладзі «КРЕОН – 2023»**
**намінацыя «Сэрца беларуса – праца. Песня беларуса – радасць працы. Гонар беларуса – слава працы»**

*Сцэнарый*
*святочнай праграмы*

# *«СВЯТА ВЯЛІКДЗЕНЬ НА СЛУЧЧЫНЕ»*

Творчае аб'яднанне «Спадчына»
Кіраўнік:
Данілаўская Ларыса Іванаўна,
намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце,
+375256038953, info@sgspl.by
Аўтарскі калектыў:
Норка Ірына Мікалаеўна,
педагог-арганізатар,
+375257129904, norkoirina@yandex.ru
Ерш Юлія Віктараўна, бібліятэкар,
+375256481039, info@sgspl.by
Сцяпанава Ала Мікалаеўна,
+37296065816, info@sgspl.by
Кананові Валянціна Мікалаеўна,
+375293587599, info@sgspl.by
Спасылка: http://www.sgspl.by

Слуцк 2023

*Анатацыя*

Ёсць розныя шляхі фарміравання ў навучэнцаў нацыянальнай самасвядомасці. Адзін з іх – выкарыстанне фальклору ў выхаваўчым працэсе ўстановы адукацыі. Знаёмства з нацыянальнымі традыцыямі і звычаямі, творамі вуснай народнай творчасці садзейнічае фарміраванню ў навучэнцаў ліцэя нацыянальнай самасвядомасці.

У сучаснай педагагічнай практыцы склаліся тры асноўныя погляды на фальклор:

- ✓ Частка народнай творчасці, дзе мастацкае адлюстраванне сапраўднага жыцця ажыцця ўляецца ў славесна-музыкальна-харэагрфічных і драматычных формах калектыўнай народнай творчасці, якая перадае светапазнанне людзей і цесна звязана з іх жыццём і побытам.
- ✓ Вузкае паняцце – сукупнасць тэкстаў, якія ўвайшлі ў вусную бытавую традыцыю этнаса.
- ✓ У шырокім паняцці – гэта традыцыйная народная культура ўвогуле.

Творы фальклору ўяўляюць сабой цікавасць не толькі дзякуючы індывідуальнай непаўторнасці, але і таму, што ў іх выражаюцца думкі і пачуцці людзей.

У мэтах удасканальвання выхаваўчай работы, захавання і перадачы гісторыка-культурнай спадчыны і народных традыцый, стымулявання творчай актыўнасці арганізатараў дасугу навучэнцаў, павышэння якасці культурна-дасугавых мерапрыемстваў адным з вядучых напрамкаў удзельнікаў выхаваўчага працэса установы адукацыі «Слуцкі дзяржаўны індустрыяльны каледж» з’яўляецца арганізацыя досугу навучэнцаў з выкарыстаннем традыцый і звычаяў Слуцкага рэгіёну.

Матэрыялы для мерапрыемстваў збіраюцца навучэнцамі каледжа – удзельнікамі мастацкай самадзейнасці, клуба «Спадчына», выхаванцамі

інтэрната. Інфармацыя апрацоўваецца творчым калектывам, які складаецца з кіраўнікоў гурткоў і клуба, педагога-арганізатара, бібліятэкара, выхаваццеляў інтэрната, намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце. Пры гэтым захоўваецца каларыт і непаўторнасць фальклору малой радзімы. У працэсе такой дзейнасці ў навучэнцаў фарміруецца думка, што фальклор – гэта каштоўнасць, якую грамадства паступовa страчвае і якую неабходна захоўваць і берагчы для будучых пакаленняў.

*Мэта:*азнаямленне навучэнцаў з гісторыяй і традыцыямі святкавання Вялікадня.

*Задачы:*

1.Пашырыць веды навучэнцаў пра хрысціянскае свята «Вялікдзень»

2. Далучыць да гісторыі і традыцый сваёй Радзімы.

3.Выхоўваць любоў і павагу да сваёй Бацькаўшчыны, народных традыцый і святаў беларускага народа.

*Выхаваўчы патэнцыял мерапрыемства:* пашырэнне ведаў вучняў пра культуру Беларусі, аб традыцыях, абрадах і святах;

*Адрас мерапрыемства:* Мінская вобл., Слуцкі раён, в. Васілінкі, вуліца Пупарава, д. 1А

*Абсталяванне:*

- мультымедыйная ўстаноўка;
- кампутар;
- калонкі музычныя.

*Дэкарацыі:*

- ручнікі, саматканыя посцілкі, свечка;
- кулічы, чырвоныя яйкі;
- галінкі вярбы;
- верацяно.

Сцэнарый правядзення свята

«Вялікдзень на Случчыне»

*Пакой па-святочнаму ўпрыгожаны ручнікамі, абрусамі, саматканымі посцілкамі, на стале стаіць свечка, вялікодныя пачастункі.*

*Свята адкрываюць гаспадар з гаспадыняй*

*Гаспадар:* Прыйшло сонейка залатое,
Каб зямелька адышла.
*Гаспадыня:* Вясна – красна к нам прыйшла,
Каб лугі зазелянеліся,
А сенажатачкі адзеліся.
*Гаспадар:* Вясна – красна к нам прыйшла,
Свята прынясла...
*Гаспадыня:* Людзі добрыя, рады ўсіх мы бачыць
На нашым свяце,
Вялікодным караваем вас пачаставаці...
Мы звычай бацькоў сваіх зберагаем,
Усіх гасцей хлебам – соллю вітаем.
Кожны хай будзе ўсмешкай сагрэт,
Калі ласка, частуйцеся, вось наш хлеб!

*Гаспадары частуюць прысутных на свяце вялікодным кулічом, потым зноў выходзяць на сцэну:*

У двары і дзядзінцы, у кватэры і хаты,
У сэрцы і душы нахлынунала свята...
Святкуем Вялікдзень...
Святкуем Вялікдзень...

*Гаспадыня (трымае ў руках чырвонае яйка)*: Сімвал нашага сеняшнега свята – яйка. Ды хіба ж толькі свята! Чырвонае вялікоднае яйка – сімвал адраджэння прыроды, крыніца яе творчых сіл. З яйка, з ніжняй часткі, выйшла маці-зямля сырая. З яйка, з верхняй часткі, устаў высокі схіл нябесны.

Каціся ж, яечка, па зямельцы, абудзі яе ад зімовага сну!

*(Гаспадыня коціць яйка па падлозе).*

*Гаспадар:* Каціся ж, яечка , людзям на радасць. Прынясі ўсім нам долю і шчасце. *(Коціць яечка па падлозе)* Наша свята працягваецца. Мы рады прапанаваць вам біткі, гульні, фанты...

*(Гаспадара перабівае гаспадыня, углядаецца у дзверы. Уваходзіць цётка Агата).*

*Гаспадыня:* Сцяпан, чакай. Гляньце, хто да нас на свята завітаў?! Цётка Агата, якая ж вы малайчына, што на свята да нас прыйшлі!

*Агата:* На свята? Якое свята! Я ж яшчэ ніяк дадому не дабяруся, рызніка свайго шукаю, то туды, то сюды, блытаецца па дарозе. А цяпер і зусім, несвянцоная костка, кабылу згубіў. А сам, анціхрыст, пэўна у карчме сядзіць, каб яму моль пяты пабіла, і з месца не скранецца. І нашто ж мяне божанька пакараў гэтай п'яніцай, гэтай недарэкай, гэтай куксамордай... (*Пачынае плакаць)*

*Гаспадыня:* Супакойцеся, цетачка Агата, паглядзіце лепей, колькі гасцей у нас сення на свяце. Гляньце, артысты якія. Супакойцеся, ды лепей раскажыце, як вы некалі Вялікдзень сустракалі, як маладыя былі.

*Агата:* О, некалі! Было гэта вельмі цікава! Зараз я вам раскажу. *(Агата пачынае свой разказ пра тое як раней сустракалі свята)*

Вечарам з кожнай сям’і звычайна гаспадар ці старэйшыя людзі ішлі ў храм на «ўсенашную». З сабою бралі па кавалачку кожнай стравы: мяса, сала, пірог, яйкі, соль і інш. Зразумела, што ні адна царква не магла ўмясціць усіх жадаючых, таму людзі часцей збіраліся ў бліжэйшых хатах,

у сваякоў і знаёмых, каб апоўначы выйсці да храма і разам з усімі хрысціянамі сустрэць радасны час вынасу з храма святых з лікам святых і ўрачыстага шэсця. [2].

Набажэнствы ў гэту ноч заканчваліся гадзін каля чатырох. На заканчэнне «усенашнай» святарнікі асвяшчалі «пасху» – прынесеныя з дому харчы. У вялікіх населеных пунктах гэты хрысціянскі рытуал паўтараўся некалькі разоў на працягу ўсяго нядзельнага дня [3].

У гэту ж ноч і тыя, хто заставаўся дома, імкнуліся не спаць. У хатах да ранку гарэла святло, запальвалі свечкі перад абразамі, маліліся Богу, расказвалі біблейскія паданні аб жыцці Ісуса Хрыста, святых Апосталаў і іншых святых.

Пасля «усенашнай» зранку ўсе, хто правёў ноч у царкве, спяшаліся ў свае сем'і. Дома кожная гаспадыня накрывала святочны стол, за які, папярэдне памаліўшыся Богу, садзіліся, «каб разгавецца». Толькі цяпер упершыню пасля доўгага сямітыднёвага посту можна было ўволю паласавацца рознымі стравамі.       Есці пачыналі з асвечанага яйка, солі і пірага, а пасля смачна снедалі. Мая бабуля, калі была маладухай, расказвала, што ў дадатак да гэтага елі яшчэ і хрэн. Хрэн для таго, каб не бачыць гадзюк у лесе і не баяцца іх. Хлеб для таго, каб карова давала многа малака. А яйка, каб жывёла была такая ж круглая. Асвечаны пірог бераглі, яго сушылі. А ў самую цяжкую хвіліну жыцця давалі яго кавалачак на здароўе, на сілу, на веру [7].

*Гаспадар:* Дзякуем, цетачка Агата! А можа хто з гасцей хоча расказаць цікавую гісторыю або выпадак пра Вялікдзень?

*Агата:* Дык зараз на свяце мая кума прысутнічае. Дзе ж яна? Кумачка, хадзі сюды да мяне бліжэй ды раскажы нам, як раней у вашым сяле святкавалі Вялікдзень.

*Выходзіць кума, запальвае свечку, чытае малітву:*

*Хрыстос уваскрэс*

*І смерцю смерць папраў,*

*І сушчым ва грабе*

*Жывот дараваў* [8].

*Кума (пачынае свой расказ):* У першы велікодны дзень людзі выходзілі з хат, каб убачыць усход сонца. Гаварылі, што ў гэты час сонца быццам «іграе на ўсходзе», пераліваецца рознымі колерамі. Такую «гульню сонца» звязвалі з «вяшчаннем на добрае лета» і шчаслівымі вяселлямі на працягу года [1].

Раніцай мыліся крынічнай вадой, у якую клалі чырвонае яйка і залатыя ці сярэбраныя прадметы, каб быць увесь год чыстым і здаровым («чырвоным, як яйка»).

Старыя, зранку расчэсваючыся, прыгаварвалі: *«Дай, Божа, колькі на галаве валасоў, каб столькі было ўнукаў!»*

У першы велікодны дзень не палілі ў печы, а тых, хто парушаў гэта правіла, страшылі, што ўлетку яго падвор'е спаліць Пярун.

У некаторых Слуцкіх вёсках, як Гацук, Прошчыцы, Уллянаўка, існавала павер'е, што калі на прывітанне «Хрыстос уваскрэс!» не адказаць, а задумаць жаданне, дык яно абавязкова збудзецца [5].

У сялян вёскі Падлессе ніколі не выкідвалі косці, што засталіся пасля святочнай трапезы, а адносілі і закапвалі іх на полі, што быццам бы садзейнічала добраму ўраджаю і засцерагала яго ад граду, буры і злых чараў розных ведзьмакоў. У суседніх вёсках з гэтай жа мэтай закапвалі на полі або пры набліжэнні буры рассцілалі на падворку абрус, на якім снедалі, калі «разгаўляліся».

*Гаспадыня:* Дзякуем вам, даражэнькая, за цікавы расказ. Цетачка Агата, а якія ж вы песні спявалі на Вялікдзень?

*Агата:* Усякія песні спявалі: і велікодныя, і вясёлыя. І зараз адну з іх мы вамі праспяваем.

*(Гучыць песня «Нова радасць стала»)*

1. Нова радасць стала,
З Дзевы ўцелавіўся,
Як чалавек пяленкамі
У Бога спавіўся.
2. Дзе Хрыстос радзіўся,
Што шчэ не бывала.
Над Батлеей звязда ясна
Свету зазіяла.
3. Пастухі з ягняткам
Перад тым Дзіцяткам.
Упадаюць на калені
Для Яго ўслаўлення.

4. І мы тож спявайма,
Хрыста праслаўляйма;
Нараджонага з Марыі
Пакорна ўпрашайма.
5. Просім Цябе, Божа,
Просімо, як можам.
Дай нам у небе жыцце шчасна,
На зямлі - прыгожа.

*Гаспадар:* Ой, малайцы! Прыгожыя песні раней спявалі, але і ў гульні, таксама гулялі. Хто хоча пагуляць, выходзьце да мяне!

(*Праводзіць гульню «Верацяно». У круг запрашаюцца хлопцы і дзяўчаты. На падлозе раскручваецца верацяно. Калі яно спыняецца і канцы яго паказваюць на хлопца і дзяўчыну, абодва будуць шчаслівымі. Калі толькі на хлопцаў ці дзяўчат, год будзе няўдачны.)*

*Гаспадыня:* Малайцы, спрытна пагулялі! Цетачка Агата, а паспявайце нам яшчэ свае песні.

*(Гучыць песня «Свет  пречистый»)*

Помню в детстве шептала мне мать:

«Свет пречистый, любви благодать».

Так шептала, склонясь надо мной,

В своей кофточке старой льняной.

Припев: Свет пречистый, души чистый свет,

Снизойди, ты меня просветли!

Ты окошко в душе отвори,

Чтобы виден мне был Божий свет!

Свет пречистый от белый берез,

Да от первой любви чистых слез.

Сколько раз я еще повторю,

Свет пречистый, пока не сгорю.

Припев.

Свет пречистый, мой светик родной,

Я вернулась, а дом мой пустой.

Лишь мерцает лампадка в окне,

«Свет пречистый» шепни, мама, мне.

Припев.

*Гаспадар:* Ой, гляньце якая чорная хмара ідзе.

*Гаспадыня:* Гэта ж ні хмара, гэта валачобнікі ходзяць і да нас зараз завітаюць.

*(Уваходзяць валачобнікі)*

*1 валачобнік:* А мы валачобнікі па вуліцы ходзім,

Да гаспадароў заходзім,

Бога праслаўляем,

Гаспадароў велічаем.

*2 валачобнік:* Дай жа, Божа, каб на вашым полі

Жыта красавала, буйны колас налівала.

Каб у час пажалі, у таку абмалацілі,

У дзяжы змясілі.

Каб у печы выпякалі, на стале краілі,

А нашыя гаспадары – здаровыя былі.

*Гаспадыня:* Дзякуем вам за пажаданні, і я вам гасцінец дам, але яечка той атрымае, хто загадкі хітрыя адгадае. Слухайце ўважліва.

1. Праз сцены вала пякуць *( Яйка).*
2. У адной дзяжы два хлебцы *(Яйка)*
3. Стаіць сасна, на сасне лён, на льне – жыта *(Стол, абрус, хлеб.)*
4. Сам голы, а сарочка за пазухай *(Свечка).*
5. Каля ямы ўсе с кіямі *(Людзі з лыжкамі вакол міскі).*
6. Поўна бочачка віна, а ні шпунту, а ні дна *(Яйка).*
7. Вісіць сіта не рукамі шыта *(Павуцінне).*
8. Маленькі, крывенькі, усё поле абскача і дамоў прыскача *(Серп)*
9. Сонца мільёнца, а ўсярэдзіне жывіца. Хто не адгадае, не будзе жаніцца *(Свечка).*
10. Сама таўстуха, дачка красатуха, сын перабор выскачыў на двор *(Печ, полымя і дым).*

*Гаспадыня:* Кемлівыя вы, гэта ж думаць. адгадалі. Трымайце гасцінцы.

*Гаспадар:* Ну, калі яйкі атрымалі, то можна і ў біткі пагуляць.

(*Адбываецца гульня ў біткі).*

*Гаспадыня:* Добра пагулялі, але давайце прыпамятаем з вамі прыказкі і прымаўкі, звязаныя са святам Вялікдзень.

*Удзельнікі свята гавораць:*

Святое Вялічка – з красным яічкам.

Вялікі дзень – вялікая работа.

З Вялікадня птушкі пачынаюць пець.

На Вялікдзень першы раз зязюля кукуе.

Кукушка кукуе ад Вялікадня да Пятра, а пасля Пятра – ні дня.

Як на чысты чыцвер добрая пагода, то і на Ўшэсце.

Дзень падаўжэў – нітка пакарацела [6].

*1 валачобнік:*

Музыканцікі, далі бог,

Не шкадуйце нашых ног.

Нашы ногі не баляць.

Яны хочуць танцаваць!

*(Выконваецца танец* «*Падыспан*»)[4]

*Гаспадар:* Ну вось, пагулялі, весела патанцавалі, а зараз можа і песню вясёлую спяем.

(*Гучыць вясёлая песня* «*Ой, ты, сваце, сівы селязеню*»,

*музыка В.Шусцікава, словы народныя).*

1. Ой, ты, сваце, сівы селязеню,

Пазваў на абед, заві на вячэру.

Прыпеў: Ой, каб наша бяседанька

Ды была б вяселенька.

У сваточка за сталом,

У сваточка за сталом.

У сваточка за сталом,

У сваточка за сталом.

2. Ой, ты, сваха, сівая галубка,

Пазвала на абед – варочайся хутка.

Прыпеў: той жа

3. Кашка з маслам – не з маім шчасцем *(выеонвае мужчынская група)*

Рыбка з перцам – не з маім сэрцам *(выконвае жаночая група)*

Прыпеў: той жа

4. Піці-есці не буду, не хочу,

Грайце, музыкі, то я вам паскочу.

Прыпеў: той жа

*Гаспадыня:* А зараз запрашаем усіх на польку.

*(Выконваецца танец «Полька»)*

*Гаспадыня:* Паважаныя госці!

Дазвольце пажадаць вам долі, шчасця,

Здароўя, як зяленага дуба, каб заўседы жылі вы люба!

*Гаспадар:* Каб доўга не спалі, дабра нажывалі!

*Гаспадыня:* Каб было ў печы пячыста, а на стале - краіста!

*Гаспадар:* Хай дасць вам Бог на жытачка род, а на статачак - плод!

*Гаспадыня:* Каб у вас вяліся куры, ды каровы,

Каб вы заўседы былі здаровы!

# Спіс літаратуры

1. Беларускі фальклор. Хрэстаматыя. Выд. 2-е дап. – Мн. “Выш. школа”. 1977. 840 с.: іл. гл. с. 111 – 133.
2. Этнаграфія Беларусі: энцык. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.: іл.
3. Васілевіч У.А. Беларускі народны каляндар. – Мн.: Ураджай. 1993 – 80 с.: іл.
4. Беларускія народныя танцы, карагоды і гульні. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 130 с.
5. З вечнага: Зборнік фальклорна- этнаграфічных матэрыялаў Случчыны – Выд. 2-е, дап. – Мн., 1990. – 65 с.
6. Катовіч А., Крук Я. Вясновыя святы: нарысы. У 2 кн. Кн. 1. – Мн.: Маст. літ., 2005. – 359 с.
7. Весенние мотивы / Ред.-сост. Л.Н. Жук – Мн.: Изд. ООО «Красико-Принт», 2003. – 128 с. (Праздник в школе). С 99 – с. 104-117. и др.
8. Беларускі праваслаўны малітоўнік: Дабраславіў на выданне Архіяпіскап Васіль. – 2-е выд. папраўл. і дап. – Таронта, Канада, 1990. – 165 с. Кансысторыя Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. с. 8-9; с. 123-125.



Прыкладанне 1

Ілюстрацыйны матэрыял



